литературной традиции произведением, представляющим эту жанровую разновидность, считается роман Марии Семеновой «Волкодав».

Мы сопоставили произведения Дж. Толкина и М. Семеновой, на основании чего выделили некоторые отличительные черты славянского фэнтези, к важнейшим из которых относятся следующие: 1) использование в качестве основы славянского, а не скандинавского или англосаксонского мифологического, этнографического и фольклорного кодов; 2) воспроизведение черт поэтики, характерной для исторического романа (например, акцентуация деталей быта, описаний обычаев); 3) моделирование отличного от традиционного типа главного героя – героя-воина, не обладающего изначально магическими способностями, представляющего расу людей; 4) смещение акцентов в трактовке универсалии Добро / Зло: невселенский характер Зла (по крайней мере, на уровне завязки действия): оно не угрожает всему миру, а персонифицировано в образе личного врага героя.

***А. У. Чэкан***
*Нав. кір.* ***З. У. Шведава,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## СТРУКТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ З КАМПАНЕНТАМ *ДАРОГА*

Фразеалагізмы знешне вельмі падобныя або на разнастайнага характару злучэнні слоў, або на сказы. За кожным фразеалагізмам замацавалася свая структура. Яна на ўзроўні нормы такая ж устойлівая і нязменная, як, скажам, і семантыка фразеалагізма. Фразеалагізмы падзяляюцца на тры структурна-фразеалагічныя разнавіднасці: фразеалагізмы-словазлучэнні, фразеалагізмы-сказы і фразеалагізмы-спалучэнні. Мэта нашага даследавання – аналіз структурнай арганізацыі фразеалагізмаў беларускай літаратурнай мовы з кампанентам *дарога*. Крыніцай матэрыялу паслужыў “Слоўнік фразеалагізмаў” І. Я. Лепешава ў двух тамах.

Сярод прааналізаваных пераважаюць фразеалагізмы са структурай словазлучэння (13 адзінак), напрыклад: *выводзіць на дарогу, з вялікай дарогі, збіваць з дарогі, прыбіраць з дарогі, стаяць на дарозе, ісці дарогай, сысці з дарогі, пракладаць дарогу* і інш.

На другім месцы паводле структурнай арганізацыі стаяць фразеалагізмы са структурай сказа. Гэты тып прадстаўлены 12 адзінкамі, якія, у сваю чаргу, маюць структуру двухсастаўнага неразвітага сказа (*дарога адкрыта, дарога адрэзана, дарога расчышчаецца, дарогі разышліся*), двухсастаўнага развітага сказа (*воўк дарогу перабег, слуп дарогу перабег*) і структуру аднасастаўнага сказа (*выбівацца на сваю дарогу, прабіваць сабе дарогу, ісці сваёй дарогай, станавіцца на слізкую дарожку, станавіцца папярок дарогі, сустракацца на вузкай дарожцы*).

Фразеалагізмы з кампанентам *дарога* са структурай спалучэння слоў прадстаўлены 4 адзінкамі, сярод якіх фразеалагізмы, утвораныя па структрунай схеме прыназоўнікава-склонавай формы назоўніка (*на дарогу, па дарозе, з дарогі*) і трохкампанентны фразеалагізм са структурай “прыслоўе+часціца+назоўнік” (*туды і дарога*).

Такім чынам, на матэрыяле адной адносна невялікай групы фразеалагізмаў беларускай літаратурнай мовы з кампанентам *дарога* праілюстраваны ўсе тры структурна-фразеалагічныя разнавіднасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ